

Пасяджэнне Рады Беларускага універсітэта культуры

# ДЗЕЛЯ БЕЛАРУСКАСЦІ, ДЗЕЛЯ АДРАДЖЭННЯ

А пачатак кастрычніка прынёс студэнтам, выкладчыкам, усім, хто рупіцца аб развіцці нацыянальнай культуры, яшчэ адно свята. І самае непасрэднае дачыненне да яго меў Беларускі універсітэт культуры. Яму споўнілася дваццаць гадоў. Якраз тады, калі пачалося бабіна лета. А яно, як вядома, і з сівымі пасмамі павуціння ў паветры і на дрэвах, што паволі скідваюць сваю лістоту. І з надзіва цёплымі днямі, якія быццам нагадваюць — яшчэ наперадзе будзе нямала цеплыні, хараства, сонечнасці.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ



Выступаюць «Валачобнікі»



**У святочнай зале Тэатра музкамеды**

Так і ва універсітэце культуры. Дваццаць пражытых гадоў — гэта ўжо гісторыя, багатая на добрыя справы і адкрыцці. А пакуль... Пакуль ёсць і мажлівасць (ды і патрэба!) азірнуцца назад, каб згадаць, што зроблена, што здзейснена.

Усё, пра што пойдзе гаворка крыху ніжэй, згадвалася і ў час урачыстага пасяджэння вучонай Рады універсітэта, на якую прыйшлі калегі з іншых вышэйшых навучальных устаноў нашай дзяржавы. І ў час вечара — таксама ўрачыстага, што ладзіўся ў Тэатры музычнай камедыі і на якім таксама было нямала гасцей, у тым ліку і з цяперашняга, як кажуць, далёкага замежжа — з Германіі, Польшчы, ЗША і іншых краін.

А асноўныя вехі універсітэта за гэтыя дваццаць гадоў — такія. Як ужо адзначалася, 1975 год — адкрыццё тагачаснага Мінскага інстытута культуры. Праз чатыры гады быў заснаваны міжведамасны навуковы зборнік «Пытанні бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства». У 1981 годзе пачаў выходзіць яшчэ адзін навуковы зборнік — «Пытанні культуры і мастацтва Беларусі», а ў 1987 годзе была створана першая ў ВНУ былога Савецкага Саюза лабараторыя «Навуковыя асновы рэкрэалогіі». Яшчэ праз два гады з'явілася свая аспірантура. 1993 год стаў акурат годам нараджэння Беларускага універсітэта культуры. У студзені сёлетняга года пры універсітэце зацверджаны савет па абароне доктарскіх дысертацый, а крыху пазней, у сакавіку месяцы, з'явіўся і савет па абароне кандыдацкіх...

Такі ён, універсітэт культуры, сёння. А калі пакарыстацца лічбамі, то гэта 3000 студэнтаў, 26 кафедраў, на якіх працуюць звыш 300 выкладчыкаў, а сярод іх больш за 20 прафесараў і 120 кандыдатаў навук, дацэнтаў. Падрыхтоўка студэнтаў вядзецца па 30 спецыяльнасцях і спецыялізацыях. Асноўныя з іх, думаецца, да месца пералічыць. Гэта — спецыялісты па сусветнай і нацыянальнай мастацкай культуры, менеджменту сацыякультурнай дзейнасці, музейнай справе і ахове помнікаў культуры, народнай творчасці, харэаграфіі, літаратурнай рабоце, сацыяльнай педагогіцы... Ды хіба ўсё згадаеш? Ці не лепей, калі ёсць магчымасць, зазірнуць у найбольш вядомыя калектывы мастацкай самадзейнасці, пабываць у Палацах культуры і клубах, бібліятэках. Там абавязкова можна сустрэць выпускнікоў колішняга інстытута культуры, а цяперашняга універсітэта.

І што самае важнае, у альма матэр яны атрымалі не толькі выдатную тэатрэтычную падрыхтоўку, а і практычныя навыкі. Ёсць студэнтам дзе праявіць сваё майстэрства, знайсці справу па густу. А многія, цяпер знакамітыя работнікі культуры ў свой час прайшлі праз добра вядомыя за межамі нашай краіны фальклорныя калектывы «Валачобнікі», «Спадчына», «Грамніцы», «Сябрына». Многія з удзячнасцю прыгадваюць, як хораша спявалася ім у хорах «Благавест», «Мара», колькі радасці прыносіў удзел у ансамблях акардэаністаў, скрыпачоў, дудароў, цымбалістаў, мандаліністаў і іншых.

Дарэчы, універсітэт, як кажуць, не замыкаецца ў сваіх сценах. Ім створаны шэраг устаноў, якія, па сутнасці, рыхтуюць для яго будучых абітурыентаў. У прыватнасці, сёлета праведзены першы набор у Мазырскую філію, а ў Магілёве на базе бібліятэчнага тэхнікума ствараецца філія па спецыяльнасці бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы. Трэці год рыхтуюцца арттэрапеўты для чарнобыльскай зоны, прыём ажыццяўляецца мэтавым наборам. Тое ж самае тычыцца і падрыхтоўкі музеязнаўцаў для Нясвіжска-Мірскага комплексу...

А ўрачыстыя мерапрыемствы ў Тэатры музычнай камедыі сталі не проста юбілейным святам, а масавым маляўнічым тэатральным відовішчам, удзельнікамі якога змаглі адчуць сябе, па сутнасці, усе, хто атрымаў запрашальныя білеты і сабраліся ў зале тэатра. А месцаў для ўсіх не хапіла. І людзі сядзелі на прыстаўных крэслах, стаялі ў праходах, уважліва ўзіраючыся на сцэну. Гэта ў першым аддзяленні, а ў другім дзейства перанеслася ў фае, якое адначасова ператварылася і ў сцэнічную пляцоўку і ў своеасаблівы... Нават слова патрэбнае не знайсці! Бо як бы змяшаліся разам і артысты і гледачы. І прафесійныя выканаўцы, у тым ліку тыя, каму пашчасціла ў свой час стаць выпускнікамі гэтай установы, і яе цяперашнія студэнты.

Сапраўды ўжо — фэст. Бадай, гэтае старое і доўгі час незаслужана забытае слова найлепш падыходзіць тут. Бо яно такое ёмістае для перадачы ўсеагульнай радасці. Бо яно і дазваляе адчуць сапраўдны водар народнага жарту, яго непаўторны досціп. А фэст — і танцы, і песні, якія, душу лагодзячы, і самога запрашаюць падпяваць, няхай і ў думках, забываючы, што табе самому мядзведзь у свой час на вуха наступіў.

Але як бы хораша ні весяліліся, як бы душа ні адпачывала, а новыя ўражанні, якія прыносіла кожная чарговая хвіліна свята, ні ў якім разе не маглі выкрасліць з памяці тых першых, што ўзніклі падчас пачатку святкавання. Акурат тады, калі зала, стомленая ў чаканні, ужо крыху неспакойна пазірала на сцэну. Ці ў кожнага віравала думка:

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

калі, калі... І гэтае «калі» прыйшло. І паяднала ў сабе дзень сённяшні з днём даўнішнім. А адбылося гэта дзякуючы дзвюм мелодыям, што як бы «наплылі» адна на другую. Запіс знакамітай «Радзіма мая дарагая...» і той, якую прынеслі і на сцэну, і ў залу майстар па рэстаўрацыі народных інструментаў У. Пузыня са сваімі паплечнікамі. І адчулі ўсе, наколькі багатыя і даўнія ў нас традыцыі, у тым ліку традыцыі культурныя.

Пра гэта, між іншым, нагадала і рэктар універсітэта Я. Грыгаровіч — мілая, сімпатычная жанчына, якая столькі самых шчырых віншаванняў прыняла і ў свой адрас, асабліва падчас урачыстага пасяджэння вучонай Рады. Што ж, Ядвіга Дамінікаўна іх заслужыла. Сваёй самаадданай, у нейкай ступені (у добрай меры!) апантанай працай. Сваёй улюбёнасцю ў беларускасць. І сваёй (думаю, тут і жанчыны пагодзяцца!) прыгажосцю. Бо гэта вельмі добра, калі суседнічаюць багацце душы і хараство прыроднае. Бо гэта проста цудоўна, калі ёсць такія людзі. Сапраўды, будуць яны — будзе жыць і Беларусь! Але пра выступленне Ядвігі Дамінікаўны... Яна якраз і нагадала, што наша нацыянальная культура зусім не з 1917 года пачалася, а мае тысячагадовыя традыцыі. І іх, гэтыя традыцыі, імкнуцца працягваць ва універсітэце. Але ва універсітэце, як падкрэсліла Я. Грыгаровіч, не вучаць, а дапамагаюць вучыцца. Тым, хто гэтага хоча, тым, чыя душа прагне ўдасканалення.

І яшчэ было нямала цёплых слоў. І з вуснаў міністра культуры і другу Рэспублікі Беларусь А. Бутэвіча, і прамоўленых Махмудам Эсэмбаевым... З'яўленне яго на сцэне для пераважнай большасці гледачоў стала прыемнай неспадзяванкай. Славуты танцор не паспяшаўся заняць свайго месца ў ганаровым прэзідыуме, а знаходзіўся доўгі час у зале, і пра яго прысутнасць маглі здагадвацца толькі тыя, хто быў з ім поруч «на галёрцы».


Выступае прафесар М. ГРЫНЧЫК

І вось Эсэмбаеў лёгкім крокам, ледзь не подбегам накіраваўся на сцэну. І тэмпераментна, магчыма, часам і залішне эмацыянальна прамовіў тое, што на яго душы. Акрамя таго, Эсэмбаеў прымае і канкрэтныя захады, каб дапамагаць развіццю культуры, у тым ліку і беларускай... Дзеля гэтага ім створаны спецыяльны фонд імя М. Эсэмбаева, у які, дарэчы, увайшлі знакаміты балетмайстар В. Елізар'еў, не менш вядомы кампазітар І. Лучанок, міністр культуры і другу А. Бутэвіч і іншыя. Мэта фонду — дапамога будучым дзеячам культуры, сённяшнім студэнтам.

Прадстаўнік жа Шлёнскага універсітэта А. Янкоўскі выйшаў віншаваць прысутных у доктарскай мантыі. А вось першаму рэктару БУКа, які стаяў ля вытокаў колішняга інстытута культуры, вядомаму драматургу А. Петрашкевічу мантыю і канфедэратку надзелі тут жа, на сцэне. Алесь Лявонцьевіч атрымаў званне ганаровага прафесара універсітэта культуры. Р. Эстэс з Тэхаскага хрысціянскага універсітэта не толькі прамаўляў прачулыя словы, а і спецыяльна для Я. Грыгаровіч выканаў новую песню. Не быў абдзелены ўвагай Р. Эстэса і выкладчык універсітэта вядомы кампазітар В. Раінчык. Яму замежны госць уручыў дыплом Міжнароднай музычнай асацыяцыі ЗША.

І, канечне ж, непаўторны момант мела сама інагурацыя, што спалучыла ў сабе і элементы тэатральнасці, і самую што ні ёсць повязь з паўсядзённасцю. (Тым самым пачынаўся для першакурснікаў сапраўдны шлях у краіну ведаў.) Праўда, падрабязна, як праходзіла яна, ужо расказана ў папярэднім матэрыяле.

У час урачыстага моманту на сцэне знаходзіліся гербы старадаўніх беларускіх гарадоў: Полацка, Брэста, Нясвіжа, Мсціслава, Оршы, Турава, перад гэтым вынесеныя з залы. Як вядома, з гэтымі гарадамі звязана дзейнасць тых, хто ў розны час рупіўся аб духоўнасці, адукацыі народа, як і прападобная Ефрасіння Полацкая, чыя выява таксама прысутнічала на сцэне і чый наказ прагучаў як напамінак аб тым, што трэба клапаціцца аб духоўным здароўі нацыі, аб усебаковым культурным развіцці.

Студэнты пакляліся быць вернымі і аддадзенымі гэтаму наказу. А тым самым яны далі згоду з'яўляцца прадаўжальнікамі і даўніх культурных традыцый свайго народа, і тых традыцый, што ўжо закладзены ва універсітэце.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

**Фота Ул. КРУКА**

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

# ПЕРШЫ ВЫПУСК

**1 верасня гэтага года штотыднёвік «Літаратура і мастацтва» пад рубрыкай «Кіно» змясціў артыкул Наталлі Еўдакімавай «Адсумавалі па новым змесце!..». Яго першая фраза проста-такі збянтэжыла дэзінфармацыяй ці, мякчэй кажучы, недакладнасцю фактаў. Вось яна: «Нядаўна адбылася падзея, важная для нашай культуры — першы выпуск сцэнарнага факультэта Беларускай акадэміі мастацтваў».**

**Па-першае, сцэнарнага факультэта няма ні ў Акадэміі мастацтваў, ні ў якой-небудзь іншай навучальнай установе, адно можна спадзявацца, што прыйдзе час, калі ён будзе створаны, хоць дарога да гэтага, па ўсім відаць, яшчэ доўгая. Па-другое, выпуск сцэнарыстаў і праўда адбыўся і стаўся — тут няма перабольшання, з гэтым, як і з іншымі фактамі артыкула, можна поўнасцю пагадзіцца — важнай падзеяй у культурным жыцці нашай рэспублікі, але да яе Беларуская акадэмія мастацтваў дачынення не мае.**

**Рэальная гісторыя такая.**

**Два гады таму знакаміты рэжысёр і сцэнарыст Віктар Тураў падабраў групу з сямі чалавек літаратурна адораных людзей, як правіла, з вышэйшай адукацыяй, улюбёных у мастацтва кіно. Пасля некалькіх месяцаў неўладкаванага становішча навучэнцаў гэты курс**